ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
06.06.2024 № 66

**Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Сусвет Тэкст» для X–XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання**

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Сусвет Тэкст» (далей – вучэбная праграма) прызначана для X–XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 69 гадзін (35 гадзін на год у X класе, 34 – у XI класе).

Змест вучэбнага матэрыялу структураваны па тэмах. Колькасць вучэбных гадзін, адведзеная ў главе 2 дадзенай вучэбнай праграмы на вывучэнне адпаведнай тэмы, з'яўляецца прыкладнай і залежыць ад відаў дзейнасці, якія арганізуе педагагічны работнік, і вучэбна-пазнавальных магчымасцей вучняў. Педагагічны работнік мае права пераразмеркаваць колькасць гадзін на вывучэнне асобных тэм у межах 35 (34) гадзін на год.

3. Мэта – фарміраванне ў вучняў універсальных складнікаў функцыянальнай адукаванасці, скіраваных на навучанне асэнсаванаму чытанню і стварэнню тэкстаў розных тыпаў.

4. Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы:

развіваць навыкі працы з інфармацыяй, якая ўтрымліваецца ў рознага роду тэкстах (мастацкіх, навукова-папулярных, афіцыйна-дзелавых, іншых) праз акумуліраванне ведаў, пры вывучэнні вучэбных прадметаў гуманітарнай адукацыі;

падтрымліваць цікавасць да чытання, фарміраваць патрэбу вучняў у сістэматычным чытанні і спасціжэнні рознага роду тэкстаў;

забяспечыць асэнсаванне тэкстаў у кантэксце розных гістарычных эпох, розных камунікатыўных сітуацый;

фарміраваць уменні пісьмовага выражэння думак, пачуццяў, эмоцый і гэтак далей;

развіваць здольнасці вучняў свабодна выкарыстоўваць навыкі чытання тэкстаў (у тым ліку крэалізаваных) для атрымання неабходнай інфармацыі;

развіваць адчуванне мовы, стылёвай звязнасці тэксту;

фарміраваць у вучняў уменні, звязаныя са стварэннем уласных тэкстаў (у тым ліку крэалізаваных) у адпаведнасці з камунікатыўнай сітуацыяй;

садзейнічаць самаразвіццю асобы ў працэсе развіцця навыкаў асэнсаванага чытання і асэнсавання рознага роду тэкстаў.

5. Формы і метады навучання і выхавання рэкамендаваны з улікам узроставых асаблівасцей вучняў X–XI класаў, змястоўнага і працэсуальнага кампанентаў вучэбнага матэрыялу. Формы, метады і сродкі навучання і выхавання павінны быць накіраваны на вучня як цэнтральную фігуру адукацыйнага працэсу, стымуляванне яго вучэбнай дзейнасці, развіццё самастойнасці.

6. Асноўныя патрабаванні да вынікаў засваення зместу вучэбнага матэрыялу выяўляюцца ў тым, што ў вучня будуць сфарміраваны:

6.1. у X класе веды пра праектную дзейнасць, спецыфіку стварэння мастацкіх твораў;

6.2. у X класе ўменні:

даваць крытычную ацэнку і інтэрпрэтаваць інфармацыю з розных пазіцый;

самастойна фармуляваць мэту, задачы праектнай і вучэбна-даследчай дзейнасці;

вызначаць неабходныя веды, уменні і навыкі, а таксама рэсурсы для паспяховай рэалізацыі праектнай і вучэбна-даследчай дзейнасці;

самастойна планаваць праектную і вучэбна-даследчую дзейнасць;

збіраць і апрацоўваць інфармацыю;

праводзіць анкетаванне і браць інтэрв'ю;

аналізаваць фармальныя і змястоўныя паказчыкі мастацкага тэксту;

ствараць і прапагандаваць уласныя мастацкія творы;

праводзіць крытычны аналіз мастацкіх тэкстаў;

6.3. у XI класе веды пра публічныя і дзелавыя тэксты, ролю рознага роду тэкстаў у соцыуме;

6.4. у XI класе ўменні:

прымяняць публічныя і дзелавыя тэксты ў залежнасці ад сітуацыі;

праводзіць дзелавыя перамовы;

вызначаць ролю стылістычных сродкаў пры стварэнні публічных і дзелавых тэкстаў;

вызначаць эфектыўнасць рознага роду тэкстаў у залежнасці ад сітуацыі;

адбіраць тэксты ў сферы дзелавых зносін.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

X клас (35 гадзін)

Праектная дзейнасць: як і што трэба рабіць (5 гадзін)

Фармуляванне мэты, задач праекта (1 гадзіна)

Паняцце праектнай і вучэбна-даследчай дзейнасці. Мэта як канкрэтны запланаваны вынік праектнай дзейнасці. Фармуляванне мэты на аснове пастаўленай праблемы. Вызначэнне задач на аснове сфармуляванай мэты.

Пошук крыніц інфармацыі (1 гадзіна)

Крыніцы інфармацыі. Фармулёўка ключавых слоў, якія адлюстроўваюць змест неабходнай інфармацыі. Пошук крыніц інфармацыі на аснове пераліку ключавых слоў.

Афармленне спіса крыніц інфармацыі.

Веды, уменні і навыкі, рэсурсы, неабходныя для рэалізацыі праекта або правядзення даследавання (1 гадзіна)

Вызначэнне неабходных для рэалізацыі праекта або правядзення даследавання ведаў, уменняў, навыкаў, а таксама рэсурсаў (у тым ліку інфармацыйных і матэрыяльна-тэхнічных).

Ацэнка рэсурсных складнікаў пры адкрыцці выдавецтва (міні-праект).

Планаванне праектнай дзейнасці (2 гадзіны)

Планаванне работы над праектам. Размеркаванне абавязкаў, выкананне работы. Вызначэнне рызыкі пры выкананні праекта.

Выбар тэмы і паслядоўнасці дзеянняў для ажыццяўлення пастаўленных мэты і задач праекта.

Вучымся пісаць мастацкія творы (30 гадзін)

Якой павінна быць сучасная мастацкая літаратура? (4 гадзіны)

Ажыццяўленне групавой праектнай дзейнасці ў межах вызначанай тэмы. Правядзенне анкетавання розных груп рэспандэнтаў. Правядзенне інтэрв'ю з аўтарытэтнымі ў сферы мастацкай літаратуры і літаратурнай крытыкі асобамі. Апрацоўка анкет і інтэрв'ю. Праца з мастацкай і публіцыстычнай літаратурай, інфармацыйнымі крыніцамі.

Напісанне матывуючага эсэ.

Збор інфармацыі для стварэння мастацкага твора (2 гадзіны)

Збор інфармацыі пра асобу, якая стане героем мастацкага твора (якой будзе прысвечаны мастацкі твор). Апрацоўка інфармацыі, адбор фактаў.

Адзінства формы і зместу (2 гадзіны)

Віды знакавых сістэм. Мастацкі твор як знакавая сістэма.

Элементы змястоўнай арганізацыі мастацкага твора (тэма, ідэя, фабула, пафас), унутранай і знешняй формы мастацкага твора (вобраз, сюжэт, арганізацыя мастацкага маўлення).

Прыметы фармальна-змястоўнай цэласнасці твора.

Аналіз асаблівасцей формы і зместу мастацкіх твораў (на выбар).

Слова. Вобраз. Тэма (3 гадзіны)

Мастацкі вобраз. Сродкі рэалізацыі вобразаў у мастацкім творы.

Спосабы рэалізацыі тэмы ў мастацкім творы.

Падбор тэмы і вызначэнне вобразнай сістэмы для напісання мастацкага твора.

Анатацыя як форма прэзентацыі мастацкага твора (1 гадзіна)

Чытацкая аўдыторыя. Роля анатацыі для прыцягнення ўвагі да мастацкага твора.

Напісанне анатацыі да ўласнага твора з улікам рознай чытацкай аўдыторыі.

Як не стаць графаманам (1 гадзіна)

Паняцце «графаманія». Небяспека графаманіі для літаратурнага працэсу. Арыентацыя мастацкай творчасці на чытача.

Ад натхнення да твора (творчы практыкум) (10 гадзін)

Стварэнне мастацкіх твораў, розных паводле віду (паэзія і проза), роду (эпас, лірыка, драма), жанру (апавяданне, замалёўка, нарыс і іншых).

Літаратурная крытыка (2 гадзіны)

Ажыццяўленне праектнай дзейнасці ў малых групах. Падрыхтоўка крытычнага аналізу мастацкіх твораў у вуснай форме.

Падрыхтоўка крытычнага агляду некалькіх мастацкіх твораў, аб’яднаных паводле пэўнай прыметы.

Афармленне зборніка мастацкіх твораў (2 гадзіны)

Дызайн зборніка мастацкіх твораў: афармленне вокладкі і старонак. Напісанне ўступнага артыкула і каментарыяў. Падбор ілюстрацый. Адбор мастацкіх твораў і іх размяшчэнне.

Прэзентацыя зборніка мастацкіх твораў (3 гадзіны)

Прэзентацыя зборніка мастацкіх твораў: выбар месца, часу, запрашэнне гасцей. Правядзенне прэс-канферэнцыі. Падвядзенне вынікаў прэзентацыі.

XI клас (34 гадзіны)

Публічныя тэксты (17 гадзін)

Крэалізаваныя тэксты і іх інтэрпрэтацыя (3 гадзіны)

Крэалізацыя як працэс. Структура крэалізаваных тэкстаў. Сродкі крэалізацыі. Практыка выкарыстання крэалізаваных тэкстаў.

Асэнсаванне тэарэтычнага матэрыялу, чытанне і аналіз прапанаваных тэкстаў-узораў. Складанне крэалізаваных тэкстаў (коміксаў, афіш, плакатаў).

Рэкламны тэкст (3 гадзіны)

Асноўнае прызначэнне рэкламнага тэксту. Віды рэкламных тэкстаў. Моўныя асаблівасці рэкламнага тэксту. Гіпнатычныя рэкламныя тэксты. Структура рэкламных тэкстаў. Слоган у рэкламных тэкстах.

Аналіз рэкламных тэкстаў (тэлевізійных, вулічных, тэкстаў з сацыяльных сетак). Складанне рэкламнага тэксту для фестывалю сацыяльнай рэкламы.

Фестываль сацыяльнай рэкламы (11 гадзін)

Віды фестываляў. Фармат правядзення. Этапы падрыхтоўкі.

Правядзенне фестывалю сацыяльнай рэкламы (папулярызацыя здаровага ладу жыцця; падтрымка неабароненых пластоў насельніцтва; барацьба з забруджваннем навакольнага асяроддзя; папулярызацыя грамадскіх арганізацый і фондаў, мэтай якіх з’яўляецца дапамога людзям, у прыватнасці, дзецям).

Дзелавыя тэксты (17 гадзін)

Дзелавыя тэксты: мэта, структура, прызначэнне (1 гадзіна)

Сфера выкарыстання дзелавых тэкстаў (юрыспрудэнцыя, эканоміка, рэклама, міжнародныя зносіны, палітыка). Віды дзелавых тэкстаў, іх структура.

Аб’явы (1 гадзіна)

План напісання аб’яў (назва дзелавой паперы, час, месца, назва мерапрыемства, адказныя). Месца размяшчэння аб’яў.

Рэдагаванне аб’яў з памылкамі. Складанне аб’яў, у тым ліку напісанне аб’явы аб прэзентацыі альбома дзелавых тэкстаў.

Пісьмы ў дзелавой сферы (інфармацыйныя, гарантыйныя, суправаджальныя і іншыя) (3 гадзіны)

Агульныя правілы напісання пісем (дата напісання, рэквізіты адпраўніка і атрымальніка, ветлівы адрасны зварот).

Лексічныя і стылістычная сродкі. Спосабы адпраўкі пісем.

Стварэнне ўласных тэкстаў пісьмаў (запрашэнне, заказ, прэтэнзія, скарга і іншыя), якія неабходны для арганізацыі прэзентацыі альбома.

Аўтабіяграфія (1 гадзіна)

Элементы аўтабіяграфіі (назва дакумента; асноўны тэкст аўтабіяграфіі, напісаны ад рукі; асабісты подпіс; дата напісання). Звесткі, якія ўказваюцца ў аўтабіяграфіі.

Знаёмства з біяграфіямі вядомых асоб і звычайных людзей. Напісанне аўтабіяграфіі.

Характарыстыка (1 гадзіна)

Правілы напісання характарыстыкі. Звесткі, неабходныя для напісання характарыстыкі (дзелавыя і асабістыя якасці чалавека).

Складанне ўласнай характарыстыкі. Напісанне характарыстыкі чалавека (літаратурнага персанажа, гістарычнай асобы і іншых).

Рэзюмэ (1 гадзіна)

Структура рэзюмэ. Навыкі напісання эфектыўнага рэзюмэ.

Стварэнне ўласных тэкстаў рэзюмэ для розных мэт (прыём на работу, атрыманне дапамогі для рэалізацыі праекта і іншых).

Распіска (1 гадзіна)

Віды распісак (пазыковая, грашовая; прадметная (беспрадметная); напісаная ад рукі (надрукаваная); аб захаванасці маёмасці; аб атрыманні дакументаў).

Перамовы (4 гадзіны)

Мэта і стратэгія перамоў. Аргументы ў перамовах. Алгарытм падрыхтоўкі да перамоў. Знешні выгляд удзельнікаў перамоў. Тэмп і тэмбр голасу. Атрыбуты перамоў (ручка, блакнот, візітныя карткі, прэзентацыя (ноўтбук), бутэлька вады і іншае).

Складанне прыкладных тэкстаў перамоў. Правядзенне перамоў.

Прэзентацыя альбома дзелавых тэкстаў (4 гадзіны)

Арганізацыя прэзентацыі. Роля альбома дзелавых тэкстаў для прафесійнай дзейнасці.